У ГАСЦЯХ – ПАЭТ І КРЫТЫК

ЛІДА. *5* лістапада члены Саюза пісьменнікаў Беларусі Руслан Піваварaў (Ліда) і Дзмітрый Радзівончык (Гродна) выступілі ў Лідскім каледжы ўстановы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы».



Навучэнцам і педагогам гуманітарнага аддзялення (спецыяльнасць «Дашкольная адукацыя») нашы калегі прэзентавалі новы сумесны праект пад назвай «Паэт і крытык» («П.і.К.»). На беларускай і рускай мовах госці расказалі пра гісторыю стварэння і ідэйны змест праекта, які нарадзіўся сёлета, пра яго мэты і задачы. Гасцям выпала прадстаўляць сваю творчасць выключна жаночай аўдыторыі, таму іх выступленні былі напоўнены лірызмам. Руслан Піваварaў прэзентаваў свае зборнікі паэзіі, прадэкламаваў уласныя вершы розных гадоў. Магістральным у праграме выступлення лідскага паэта стаў вобраз сучаснай беларускай жанчыны. Руслан Анатольевіч пастараўся суаднесці ўласцівыя жаночаму пачатку матывы рамантыкі, пяшчотнай вытанчанасці, а таксама высокія ідэалы, гуманістычныя перакананні нашых жанчын са шматлікімі выклікамі часу. Галоўнай думкай прагучаўшых у аўтарскім прачытанні твораў і каментарах да іх сталі вечная, нязменная чысціня і святло, якімі жанчына напаўняе наш свет ва ўсе, нават самыя няпростыя часы. Таму разнастайныя праявы грубасці і амаральнасці павінны здалёк абыходзіць гэты сімвал любові і кахання, сакральны вобраз маці, захавальніцы сямейнага ачага, з якім род чалавечы звязвае надзеі на свой працяг, а натхнёная ім душа чалавека набывае жыццё вечнае. Прынамсі пра гэта сведчаць шматлікія ўзоры сусветнага і айчыннага мастацтва, у тым ліку літаратурнага. Выступленне члена СПБ, паэта Руслана Піваварава насіла ідэйна-асветніцкі, выхаваўчы характар.

Затым паэт перадаў эстафету крытыку. Адна з ключавых асаблівасцяў тандэму, новага сумеснага праекта лідскага і гродзенскага літаратараў «П.і.К.» у тым, што, з’яўляючыся паэтам і крытыкам, творцы застаюцца сябрамі. Дружба як пазачасавая і пазапрасторавая катэгорыя, як панацэя ад бед і непаразуменняў, як найвышэйшая

кропка камунікацыі, найвышэйшая форма існавання чалавека ў свеце людзей і ў свеце мастацтва. Згода, сяброўства, дружалюбнасць… Што можа быць вышэй і высакародней? Дзмітрый Радзівончык прэзентаваў калектыўны праект Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ, зборнік прысвячэнняў сучасных літаратараў Гродзеншчыны класікам беларускай літаратуры «Песнярам Айчыны». Таксама паэт, публіцыст з Гродна пазнаёміў гаспадароў з уласным зборнікам літаратурна-крытычных артыкулаў «Масты і берагі», выданнем, якое сёлета прынесла гродзенскаму пісьменніку высокую дзяржаўную ўзнагароду – Нацыянальную літаратурную прэмію Рэспублікі Беларусь у намінацый «Лепшы твор літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства». Падарункам слухачам за ўвагу стаў запіс песні ў выкананні паэта і слайд-шоў пра яго прыватнае жыццё па-за літаратурнай дзейнасцю. Прагучала і беларуская паэзія гродзенскага аўтара.

Асобнай тэматычнай старонкай літаратурнай сустрэчы стала 135-годдзе з дня нараджэння Максіма Багдановіча. Руслан Піваварaў пазнаёміў аўдыторыю са сваім перакладам аднаго з твораў класіка на рускую мову. А Дзмітрый Радзівончык прадэкламаваў уласны твор, напісаны па матывах верша «Песняра чыстае красы». У фінале сустрэчы (якая, дарэчы, адбылася двойчы – для дзвюх груп навучэнцаў) госці падарылі каледжу свае кнігі з аўтарскімі аўтографамі. Скончылася ж мерапрыемства фотасесіяй. Гаспадары (моладзь і педагогі) шчыра падзякавалі літаратарам за змястоўную сустрэчу і яркія ўражанні ад яе. Рэалізацыя новага творчага праекта двух літаратараў ва ўстановах адукацыі будзе прадоўжана.

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ

На фота: перад навучэнскай моладдзю і педагогамі з прэзентацыяй сумеснага творчага праекта «Паэт і крытык» («П.і.К.») выступілі члены СПБ Руслан Піваварaў (Ліда) і Дзмітрый Радзівончык (Гродна). Лідскі каледж установы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы». 5 лістапада 2026 года.










ИНФОРМАЦИЯ
ПЕСНЯРАМ
АЙЧЫНЫ


ИНФОР
ОТРАЖЕНИЯ
ОТРАЖЕНИЯ
БЕСЕДА




ПЕСНЯРАМ
АИЧЫНЫ


ПЕСНЯРАМ
ДЗІЦЯЧЫ


МАЙСТРО ПАГАНІНІ
БОФФА




ПЕСНЯРАМ ДЗІЧЫНЫ
ИНФОРМАЦИЯ


ПЕСНЯРАМ АЙЧЫНЫ
WHAT ABOUT
BARB
МАЭСТРО ПАГАНИНИ
БЕСЕДА


ФОРМАЦИЯ
Я - ВОСПИТАТЕЛЬ
УЧЕБНОЕ ЗАНЯТИЕ
ЭСТЕТИЧЕСКОЕ ВОСПИТАНИЕ
ОТРАЖЕНИЯ
МАЭСТРО ПАГАНИНИ


ПЕСНЯРАМ
АЙЧЫНЫ


ИНФОРМАЦИЯ
Руслан ПИВОВАРОВ
МАЭСТРО ПАГАНИНИ





Лидский колледж
LTK.grsu.by

www.pisateli.by